празаікаў А.Асташонка «Няўжо я памру?», «Формула асобы» і Б.Пятровіча «Мроі». Як яскравы твор постмадэрнізму паўстае спектакль паводле трагіфарса Г.Марчука «Пеўчыя» Рэспубліканскага тэатра-лабараторыі беларускай драматургіі «Вольная сцэна», пастаўлены Мікалаем Дзінавым.

У плане традыцыйнага ўспрымання тэатральнае відовішча «Пеўчыя» быццам бы не ўяўляе сабой закончанага спектакля, бо тут адсутнічае агульная ідэя сцвярджэння-адмаўлення, якая б аб'ядноўвала ўсе «галасы» персанажаў у завершана цэласны твор. Спектакль проста адлюстроўвае несупадзенне, несумежнасць уяўленняў кожнага з персанажаў аб сабе і аб жыцці з самім жыццём, дзякуючы тым абставінам, у якія яны трапляюць. Ен вельмі красамоўна перадае той стан грамадскай свядомасці, які ўтварыўся ў нас на Беларусі ў цяперашніх умовах. Але тым не менш заслужаны артыст Беларусі Уладзімір Рагаўцоў у ролі Святара праніклівa раскрыў трагізм лёсу чалавека, высокую трагедыйнасць ягоных спрадвечных духоўных пошукаў і напружана-супярэчлівага вечнага роздуму аб вышэйшым сэнсе чалавечага існавання. І гэта - ад гуманістычных традыцый усёй папярэдняй культуры.

Тэорыя постмадэрнізму, як і яго мастацкая практыка, адмаўляючы ісціннасць нашых ведаў аб свеце, усе ж толькі паўторна ўздымае вечнае, традыцыйнае пытанне аб іх адноснасці, абмежаванасці. З гэтай прычыны можна ўзгадаць хаця б «Эдыпа-цара» антычнага Сафокла ці «пострэнесансную» літаратуру барока.

Гэта тэорыя - проста чарговы роздум на чарговым раздарожжы, у якім напрыканцы 2-га тысячагоддзя н.э. апынулася чалавецтва.

Дуркіна Г.Р.,
ст.выкладчык

## РОЛЯ СПЕЦКУРСАЎ У ВЫВУЧЭННІ ПОСТМАДЭРНІСЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Постмадэрн як літаратуразнаўчае паняцце стала ўжывацца ў канцы 70-х - пачатку 80-х гадоў. Яно паслядоўна ўкаранялася ў такія сферы, як архітэктура, жывапіс, затым сацыялогія, філасофія і інш. Яшчэ ў 1955 г. Фідлер пісаў аб агоніі літаратурнага мадэрну і нараджэнні постамадэрну. Тэрмін «постамадэрнізм» не мае адзінага азначэння ні ў замежнай, ні ў нашай айчыннай навуцы. Постмадэрнізм, узмацніўшы крытыку мадэрнізму, абвясціўшы ідэю вяртання мастацтва ў рамкі мастацтва, у пошуках сродкаў мастацкай мовы адкрыта арыентуецца на звычайны густ, погляды і настрой масавага ўсведамлення, ліквідуючы шчыліну паміж мастакамі і публікай, паміж прафесіяналам і дылетантам ў сферы мастацтва. Постмадэрнізм (у жывапісе і скульптуры яго называюць трансавангардам) звязаны з плюралізмам, г.зн. распадам адзінства, які абазначае канец Адзінага, Цэласнага, імкнецца замацаваць і развіць выяўляемую множнасць ў яе легітымнасці і своеасаблівасці. Такім чынам, постмадэрнізм пачынаецца там, дзе заканчваецца цэлае. Ён вельмі розны, постмадэрнізм, і дапамагчы студэнтам спасцігнуць логіку ваганняў і ўнутраных супярэчнасцей «цякучага» постмадэрнісцкага працэсу магчыма праз яго паглыбленае вывучэнне на занятках спецкурсаў па літаратуры. Гэтыя спецкурсы павінны садзейнічаць павышэнню прафесійнага ўзроўню будучых спецыялістаў, развіццю мастацкай і інфармацыйнай культуры, пашырэнню іх кругагляду, далучэнню да навуковай работы. Кожнае дзесяцігоддзе багата мастацкімі адкрыццямі, але ў жорсткіх рамках вучэбных гадзін не заўжды ёсць магчымасць назваць імёны пісьменнікаў, якія ўнеслі свой уклад у развіццё літаратуры.

Мэта спецкурса, яго метадалогія ў многім вызначаюцца самой назвай. Як правіла, адна з сур'ёзных праблем спецкурсаў заключаецца ў іх метадалагічнай незабяспечанасці, у сувязі з чым узнікаюць пэўныя цяжкасці з адборам матэрыялу. Не менш важнай праблемай спецкурсаў па літаратуры з'яўляецца іх навуковая нераспрацаванасць. Цяжкасці ў асваенні гэтых курсаў могуць быць па прычыне адсутнасці вучэбнай літаратуры.

Тым не менш спецкурсы па літаратуры павінны заняць сур'ёзнае месца ў сістэме падрыхтоўкі будучых спецыялістаў, г.зн. яны павінны знаёміць студэнтаў з важнейшымі падзеямі культурнага і літаратурнага жыцця, дапаўняючы праграму асноўнага чытаемага курса, развіваць маральнасць, дапамагаючы тым самым процістаяць шматлікім хваравітым з'явам сучаснага духоўнага жыцця: безгеройнасці і безыдэальнасці, актывізацыі масавай культуры і яе куміраў. Гэтыя спецкурсы па літаратуры павінны чытацца пасля таго, калі асноўны курс сусветнай літаратуры ўжо ў асноўным прачытаны.

Фарміраванне вучэбных праграм спецкурсаў ідзе, галоўным чынам, адвольным шляхам і, як паказвае практыка, у значнай ступені залежыць ад спецыфікі і традыцый канкрэтнай навучальнай установы, ад асобы выкладчыка. Але мы лічым, што ў любым выпадку спецкурсы павінны садзейнічаць росту прафесійнай свядомасці.

Прафесійная накіраванасць заняткаў па спецкурсу праяўляецца ў наступным: студэнтам даецца матэрыял прафесійна-тэарэтычнага накірунку; вылучаецца абавязковы мінімум ведаў

па прадмету; фармулюецца сістэмны стыль мыслення, галоўнай рысай якога ў нашы дні стала гуманітарызацыя; выпрацоўваюцца практычныя навыкі, якія забяспечваюць эфектыўнасць будучай прафесіі; студэнты навучаюцца мастацтву пошуку; ажыццяўляюцца міжпрадметныя сувязі.

Ільіна Н.Р.,
ст.выкладчык

## БЕЛАРУСКА-РУСКІЯ ЛІТАРАТУРНЫЯ СУВЯЗІ ВА ЎМОВАХ НАЦЫЯНАЛЬНАГА АДРАДЖЭННЯ

Ва ўмовах нацыянальнага адраджэння вельмі важна, каб вышэйшая навучальная ўстанова рыхтавала спецыялістаў, якія здольны свядома і адказна прымаць рашэнні. Выпускнікі Беларускага універсітэта культуры павінны station... 

Культурныя сувязі паміж Расіяй і Беларуссю маюць даўнюю традыцыю. У гэтым рэчышчы не трэба забываць і ўзаемаадносіны паміж беларускімі і рускімі пісьменнікамі - таленавітымі мастакамі слова.

Нагадаем Ф.М.Дастаеўскага, чыя творчасць аказала вялікае ўздзеянне на эстэтычную свядомасць яго сучаснікаў і нашчадкаў. Героі Дастаеўскага - носьбіты важнай грамадскай, палітычнай і філасофскай думкі.

Беларускі празаік Максім Гарэцкі ў сваіх апавяданнях аб інтэлігентах «з-пад саламянай страхі» паказваў людзей, захопленых ідэяй адраджэння роднага краю і роднай культуры. У Дастаеўскага ж вучыўся М.Гарэцкі даследаванню таямніц чалавечай псіхікі. Рускага і беларускага пісьменнікаў збліжаюць маштабнасць і складанасць пастаўленых у іх творчасці пытанняў.

Для сённяшняй моладзі вельмі важным з'яўляецца пытанне пазнання нацыянальнага характару. Калі мы параўнаем такія творы, як «Браты Карамазавы» і «Антон», то ўбачым, што Дастаеўскі будуе канцэпцыю рускага нацыянальнага характару вакол забойства сынам бацькі, а М.Гарэцкі робіць спробу паказаць нацыянальны характар беларуса, даследуючы выпадак забойства бацькам сына. Блізкія да персанажаў з твораў Дастаеўскага ў аповесці Беларускі аўтар, Польскі публіцыст і Маскоўскі дэмакрат. Героі апавяданняў М.Гарэцкага «У лазні», «Роднае карэнне», «Рунь», Антон з аповесці «Антон», як і героі Дастаеўскага, знаходзяцца ў палоне духоўных пошукаў. У гэтых пошуках ўдзельнічаюць і інтэлігенты, і простыя сяляне. Мара аб духоўна прыгожым чалавеку яднае творы беларускага празаіка М.Гарэцкага і рускага мастака слова Ф.Дастаеўскага.

Вялікай папулярнасцю на Беларусі карысталася і карыстаецца імя Л.Талстога. У яго было шмат карэспандэнтаў з ліку нашых суайчыннікаў. Жыхары Мінска ў 1908 г. абралі яго ганаровым членам Мінскай гарадской бібліятэкі. Сам Л.Талстой клапаціўся аб пашырэнні асветы, таму высылаў кнігі для сельскіх школьных бібліятэк, якія існавалі на тэрыторыі Беларусі. Вялікі рускі пісьменнік лічыў сапраўднай тую літаратуру, якая была блізкай і зразумелай простаму чытачу. У асобе рускага празаіка беларускім пісьменнікам бачыўся абаронца права беларуса на сваю мову, сваю культуру, якой бы мужыцкай яна ні здавалася «адукаванаму» чытачу. Творы Л.Талстога перакладаліся на беларускую мову і друкаваліся на старонках «Нашай нівы». Значную ролю талстоўскія ідэі адыгралі і ў творчасці М.Гарэцкага, асабліва ў распрацоўцы тэмы першай сусветнай вайны.

Ва ўмовах нацыянальнага адраджэння станаўленне беларускай мастацкай мовы з'яўляецца справай агульнаграмадскай. І літаратура набывае універсальны характар, выяўляючы і канцэнтруючы ўсе разнастайныя праявы нацыянальнай духоўнасці.

Саладоўнікаў С.В.,
дацэнт

## МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА І ПРАБЛЕМЫ ЎДАСКАНАЛЕННЯ ГУМАНІТАРНАЙ АДУКАЦЫІ

Удасканаленне гуманітарнай адукацыі ў сучасных умовах ляжыць на шляхах павышэння духоўнага ўзроўню студэнта. А духоўны ўзровень яго знаходзіцца ў прамой залежнасці ад шырыні гуманітарнага кругагляду. Тут і глыбокія веды, і добры мастацкі густ, і пэўная вытанчанасць. Гуманітарны кругагляд таксама прадугледжвае разуменне праблем, якія стаяць перад чалавецтвам у канцы XX стагоддзя.

У гуманітарнай адукацыі заўсёды значную ролю адыгрывалі такія дысцыпліны, як гісторыя, філасофія, філалогія (літаратура і мова), эканоміка, мастацтвазнаўства. Традыцыйна ўсе гэтыя дысцыпліны ў ВНУ вывучаюцца паасобку. Тым не менш пры аналізе літаратурных твораў вылучаюцца філасофскія і гістарычныя аспекты, эканамічныя і сацыяльныя, псіхалагічныя і інш. Героі літаратурных твораў нясуць на сабе адбіткі самых розных